*1. Гудзенко, Л. Г.* Социально-культурная деятельность как средство преодоления кризиса становления профессионала на этапе адепта / Л. Г. Гудзенко // Материалы междунар. научн.-практ. конф. «Культура и искусство в образовании: опыт и перспективы развития». – Талдыкорган, 2021. – С. 131–136.
*2. Журлова, И. В.* Клубная деятельность – форма организации молодежного досуга / И. В. Журлова // Пазашкольнае выхаванне. – 2000. – № 5. – С. 17–19.
*3. Малахова, И. А.* Развитие креативности личности в социокультурной сфере: педагогический аспект / И. А. Малахова. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2006. – 327 с.

УДК 069(476) (091)

# ПАСЛЯ КУЛЬТУРНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ: МУЗЕЙНАЯ «АДЛІГА» 1938–1941 гг. У БССР

***А. А. Гужалоўскі,*** *доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны маладаследаванаму і складанаму перыяду гісторыі музейнай справы Беларусі, які ахоплівае 1938–1941 гг. Яго ніжняя храналагічная мяжа вызначана заканчэннем культурнай рэвалюцыі, верхняя – акупацыяй тэрыторыі БССР нямецкімі войскамі. Музейную «адлігу» ў разглядаемы час вызначыла лібералізацыя, вяртанне да нормы ў культурнай сферы. Палітыку знішчэння «дваранска-буржуазнай» культуры змянілі асцярожныя спробы ўлады выкарыстаць элементы старой культуры для дасягнення новых задач сацыялістычнага будаўніцтва. У выніку былі адноўлены органы кіравання музейнай справай у рэспубліцы, яе культурны ландшафт узбагацілі такія ўстановы, як Дзяржаўная карцінная галерэя БССР, Галерэя Ю. М. Пэна, музей Тэатра оперы і балета БССР. Шэраг музеяў атрымаў будынкі, дзе былі разгорнуты новыя экспазіцыі, што, у сваю чаргу, абумовіла павелічэнне колькасці наведвальнікаў.
**Ключавыя словы:** культура, музей, «адліга», калекцыя, экспазіцыя, наведвальнік.

# AFTER CULTURAL REVOLUTION: MUSEUM «THAW» 1938–1941 IN SOVIET BELARUS

***A. Huzhalouski,*** *Doctor of Historical Sciences, Professor, Professor of the Department of Ethnology, Museology and Art History of the Belarusian State University*

**Abstract.** The article is devoted to the understudied and complex period of Belarusian museum history which covers 1938–1941. The beginning of the period was determined by the end of the Cultural Revolution, its ending – by intrusion of German troops to the Soviet Belarus. Museum «thaw» of the period under review was deter-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

mined by liberalization, returning to the normality in the cultural sphere. The policy of destroying the «noble-bourgeois» culture was changed by the authorities' cautious attempts to use elements of the old culture to achieve the new tasks of socialist construction. As a result, the museum governing bodies were restored in Belarus, its cultural landscape was enriched by such institutions as the State Art Gallery, the Judal Pen Gallery, and the Museum of Opera and Ballet Theater. A number of museums received buildings where new exhibitions were created, which, in turn, led to an increase in the number of visitors.
**Keywords:** culture, museum, «thaw», collection, exhibition, visitor.

У канцы 1920-х гг. паралельна з індустрыялізацыяй і калектывізацыяй партыйнае кіраўніцтва СССР распачало масіраваную трансфармацыю культурнага жыцця савецкага грамадства, якая ўвайшла ў гістарыяграфію пад назвай «культурная рэвалюцыя». Галоўнай задачай культурнай рэвалюцыі, якая ў цэлым была рэалізавана ў гады дзвюх першых пяцігодак (1928–1937), з'яўлялася ўкараненне ў асабістыя перакананні савецкіх грамадзян марксісцка-ленінскай ідэалогіі. Паводле задумы партыйных ідэолагаў часткай новай афіцыйнай савецкай культуры, разам з літаратурай, тэатрам і кіно, павінен быў стаць музей.

Развіццё дзяржаўных музеяў БССР у 1928–1937 гг. адбывалася як частка агульнадзяржаўнай і партыйнай прапагандысцкай работы. Гіпертрафіраваліся прапагандысцкія функцыі музеяў пры недаацэнцы спецыфікі музея як навукова-даследчай і культурна-асветніцкай установы. На працягу першай паловы 1930-х гг. былі скасаваны Галоўнавука і Музейная рада як калегіяльныя органы, якія ўключалі буйнейшых прадстаўнікоў беларускай навукі і культуры. Беларускія музеі апынуліся ў падпарадкаванні розных ведамстваў без каардынацыі паміж імі.

У 1934 г. з пачаткам узвядзення на месцы Архірэйскага падвор'я Дома Чырвонай Арміі згубіў памяшканне Беларускі дзяржаўны музей у Мінску. У 1938 г. пасля падрыву Іосіфаўскай царквы прыпыніў існаванне Магілёўскі краязнаўчы музей. Пастановай ЦК КП(б)Б ад 28 ліпеня 1937 г. было вырашана закрыць Гомельскі гістарычны музей, які з-за спецыфікі сваіх «палацавых» калекцый не мог выконваць прапагандысцкія функцыі. І толькі выпадковая рэпліка пра неабходнасць берагчы сабранае, кінутая К. Я. Варашылавым падчас агляду палаца Румянцавых–Паскевічаў, уратавала каштоўны збор. Паводле ілжывых абвінавачванняў у нацыянал-дэмакратызме і трацкізме былі рэпрэсіраваны дзясяткі музейных работнікаў. Непапраўную шкоду музейным зборам у 1928–1933 гг. нанеслі продажы за мяжу найбольш каштоўных прадметаў з мэтай атрымання грошай для выканання першага пяцігадовага плана [8, с. 45–55].

Напрыканцы 1938 г. у Савецкім Саюзе, які прайшоў праз выпрабаванне вялікім тэрорам, назіраліся новыя з'явы ў розных галінах жыцця. Спыніліся масавыя арышты, са зняволення вярнуліся некалькі дзясяткаў тысяч чалавек. Адначасова пасля абвяшчэння рашучых поспехаў культурнай рэвалюцыі з'явілася тэндэнцыя да лібералізацыі, вяртання да нормы ў куль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

турнай сферы. Палітыку знішчэння «дваранска-буржуазнай» культуры змянілі асцярожныя спробы ўлады выкарыстаць элементы старой культуры дзеля дасягнення новых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

У БССР перыяд культурнай лібералізацыі супаў з прызначэннем летам 1938 г. на пасаду першага сакратара ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнкі – бібліяфіла, аматара выяўленчага мастацтва, гарачага прыхільніка джаза, будучага першага міністра культуры СССР (1953–1954). Менавіта пад яго кіраўніцтвам быў праведзены шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на ўзнаўленне музейнай сеткі і ахову помнікаў рэспублікі, паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнага становішча музеяў, забеспячэнне іх кваліфікаванымі кадрамі.

Музейная гаспадарка, якую атрымаў П. К. Панамарэнка ад папярэдніх кіраўнікоў рэспублікі, была далёкая ад ідэалу. У музеях сістэмы Народнага камісарыята асветы ў Мінску, Віцебску, Магілёве і Гомелі карціны, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, парцаляна, нумізматыка, старажытная мэбля захоўваліся «...у большасці выпадкаў у вільготных склепах, зваленыя ў бясформенную кучу». Падпарадкаваныя мясцовым уладам краязнаўчыя музеі ў Рэчыцы, Оршы, Тураве былі даведзены да стану поўнага развалу, а ў Полацку і Бабруйску толькі зрэдку дапускалі наведвальнікаў. Мазырскі раённы савет забраў у мясцовага краязнаўчага музея памяшканне, а калекцыі загадаў перавезці ў педвучылішча. У Доме-музеі I з'езда РСДРП пражывалі яго супрацоўнікі, у т. л. былыя [13, с. 3]. «Патрэбна карэнная рэформа музейнай справы. Яна наспела», – заклікаў грамадскасць навуковы супрацоўнік Віцебскага абласнога краязнаўчага музея І. І. Васілевіч [5, с. 4].

Гэта крытыка была пачута ўладай. У 1939 г. у дадатак да існаваўшай у апараце Народнага камісарыята асветы БССР пасады музейнага інспектара пры камісарыяце ствараецца грамадскі Музейны савет на чале з дацэнтам БДУ У. І. Шаўчэнкам. Музейны інспектар з дапамогай членаў савета распачаў інвентарызацыю музейных калекцый, улік наведваемасці музейных устаноў грамадствам, рабіліся захады па забеспячэнні музеяў належнымі будынкамі. Для абследавання музеяў з Мінска на месцы накіроўваліся дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР, якія дакладалі вынікі камандзіровак непасрэдна старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета Н. Я. Наталевічу [11, с. 43–56].

У красавіку 1939 г. П. К. Панамарэнка скасаваў загад народнага камісара асветы Е. І. Уралавай аб далучэнні Мінскага абласнога гістарычнага музея да Музея рэвалюцыі БССР, а у канцы 1940 г. пагадзіўся на яго перайменаванне ў Дзяржаўны гістарычны музей БССР. Вяртанню гістарычнаму музею статуса галоўнай музейнай установы рэспублікі папярэднічала інтэнсіўная праца па абнаўленні экспазіцыі ў Юбілейным доме (будынку Царкоўна-археалагічнага музея), у выніку якой туды вярнуліся аўтэнтычныя прадметы, што адлюстроўвалі розныя перыяды айчыннай гісторыі. Так, у ёй з'явіўся багаты археалагічны аддзел, тураўская каменная грабніца, парт-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэты слуцкіх князёў Алелькавічаў XV ст., даспехі і гарматы з Нясвіжскага замка, дакументы Мінскага праваслаўнага брацтва XVI ст., зброя ўдзельнікаў паўстанняў канца XVIII – першай паловы XIX ст., ключ ад Бабруйскай крэпасці, шабля маршала Нэя і інш. [12, с. 4]. Пра «рэабілітацыю» музейнага прадмета сведчылі таксама змены, што адбываліся ў экспазіцыях Віцебскага і Гомельскага музеяў.

Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР на пасяджэннях Бюро ЦК КПБ пад кіраўніцтвам П. К. Панамарэнкі неаднаразова ставілася пытанне аб культурных каштоўнасцях, якія засталіся ў замку Радзівілаў. 27 снежня 1939 г. было прынята рашэнне аб адкрыцці ў Нясвіжскім замку гістарычнага музея, але праз некалькі дзён яно было адменена пад ціскам кіраўніцтва НКУС БССР, якое адкрыла ў замку ведамасны санаторый [6, с. 73].

Важная падзея ў музейным і мастацкім жыцці рэспублікі адбылася 7 лістапада 1939 г., калі ў пятнаццаці залах будынка Вышэйшай камуністычнай сельскагаспадарчай школы адкрылася Дзяржаўная мастацкая галерэя БССР. На яе адкрыцці прысутнічала ўсё кіраўніцтва Савецкай Беларусі на чале з П. К. Панамарэнкам. Падмурак фондавага збору галерэі склалі творы з аддзелаў выяўленчага мастацтва музеяў Мінска, Віцебска, Магілёва, Гомеля, Траццякоўскай галерэі, Рускага музея, Эрмітажа, а таксама Нясвіжскага замка. Акрамя аддзелаў жывапісу, скульптуры і графікі, у галерэі меўся аддзел мастацкай прамысловасці. Напярэдадні пачатку вайны агульная колькасць твораў мастацтва ў фондах Дзяржаўнай мастацкай галерэі БССР дасягнула 3,3 тыс. адзінак [2, с. 4].

Вялікай папулярнасцю ў гледачоў карыстаўся адкрыты ў 1941 г. музей Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР, які адлюстроўваў яго творчы шлях [3, с. 1].

Змена савецкай культурнай палітыкі ў разглядаемы час прасочваецца і на рэгіянальным узроўні. У 1939 г. была створана мастацкая галерэя, прысвечаная творчасці славутага віцебскага жывапісца і педагога Ю. М. Пэна, які за два тыдні да сваёй трагічнай смерці ахвяраваў гораду 772 карціны. Галерэя Ю. М. Пэна займала два вялікія пакоі ў былой кватэры мастака, дзе дэманстраваліся такія шэдэўры, як «Апошняя субота», «Развод», «Чалавек у чырвоным», «Стары цыган», «Жабрак» і інш. Нягледзячы на абмежаваныя магчымасці праводзіць у гэтых умовах шырокую асветніцкую работу, у апошні перадваенны 1940 г. галерэю наведала больш за 15 тыс. чалавек, для якіх было арганізавана больш за 230 экскурсій [14, с. 4].

У маі 1940 г. у будынку Антоніеўскага касцёла адкрыўся філіял Віцебскага сацыяльна-гістарычнага музея – Антырэлігійны музей. У тым жа годзе было пастаўлена пытанне аб аднаўленні Рэчыцкага краязнаўчага музея, Сафійскі сабор у Полацку перадалі Народнаму камісарыяту асветы для арганізацыі ў ім краязнаўчага музея, а Бабруйскі краязнаўчы музей прыняў рэкордныя 29 тыс. наведвальнікаў. Увогуле наведваемасць музеяў БССР дэманстравала станоўчую дынаміку: калі ў 1937 г. іх агледзелі 132,7 тыс. чалавек, то ў 1939 г. – 435,8 тыс. [10, с. 54].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У лютым 1940 г. намаганнямі У. І. Шаўчэнкі быў узноўлены «зачынены ворагамі народа» гісторыка-археалагічны музей БДУ з аддзеламі Старажытнага Егіпта, антычнай Грэцыі і Рыма, старажытных антычных паселішчаў на поўдні СССР і інш. [1, с. 4]. Да святкавання дваццацігоддзя ўніверсітэта ў кастрычніку 1941 г. планавалася таксама скончыць рэнавацыю яго заалагічнага і геалагічнага музеяў [4, с. 2]. У студзені 1941 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё Музея лыж Беларускага інстытута фізкультуры [7, с. 4]. Значную ролю ў правядзенні навуковых даследаванняў адыгрывалі музеі Інстытута геалогіі і Інстытута харчовай прамысловасці АН БССР. Летам 1939 г. больш прасторнае памяшканне ў будынку Акадэміі навук атрымаў Музей рэвалюцыі БССР [9, с. 2].

Сярод іншых музейных ініцыятыў разглядаемага часу можна прыгадаць правядзенне рэспубліканскіх экспедыцый па выяўленні помнікаў культуры, захады ўрада па перадачы ў Мінск фондаў Беларускага музея ў Вільні, адкрыццё ў мінскім Парку культуры і адпачынку імя Горкага музейна-выставачнай залы.

У кастрычніку 1939 г. Наркамат асветы БССР накіраваў у далучаныя заходнія раёны рэспублікі брыгаду навуковых супрацоўнікаў музеяў, якая абследавала мясцовыя музеі і помнікі. Падчас абследавання былі ўзяты на ўлік найбольш каштоўныя аб’екты, у мясцовыя бюджэты ўключаны выдаткі на ўтрыманне існаваўшых музеяў, для СНК БССР падрыхтавана прапанова забараніць вываз з далучаных тэрыторый мастацкіх і архіўных каштоўнасцей без спецыяльнага дазволу. Народнагаспадарчы план на 1940 г. прадугледжваў арганізацыю новых і саветызацыю існаваўшых раней у Заходняй Беларусі наступных музеяў: абласных гісторыка-рэвалюцыйных – у Беластоку, Брэсце і Пінску, раённых краязнаўчых – у Ваўкавыску, Слоніме, Міры, літаратурнага – у Навагрудку, выяўленчых мастацтваў – у Баранавічах і Беластоку, гістарычнага – у Гродна [11, с 18].

Выкананне гэтага плана, як і ўсю музейную «адлігу», якая распачалася ў БССР на мяжы 1930–40-х гг., перарвала акупацыя тэрыторыі рэспублікі нямецкімі войскамі.

*1.* Адкрыццё гісторыка-археалагічнага музея // Звязда. – 1940. – 12 лют. – № 35.

*2.* Багатыя калекцыі карціннай галерэі БССР // Звязда. – 1941. – 12 чэрв. – № 137.

*3. Бадзяйла, М.* Музей試Опернага тэатра / М. Бадзяйла // ЛіМ. – 1941. – 31 мая. – № 22.

*4.* БДУ напярэдадні юбілею (гутарка з рэктарам універсітэта тав. П. П. Савіцкім) // Звязда. – 1941. – 20 чэрв. – № 144.

*5. Васілевіч, І. І.* Аб дрэнных кіраўніках і забытых музеях / І. І. Васілевіч // ЛіМ. – 1939. – 23 ліп. – № 27.

*6. Высоцкая, Н.* О несвижской коллекции по документам ЦК КПБ. 1939–1941 гг. / Н. Высоцкая, А. Михальченко // Нясвіжскія зборы Радзівілаў: іх фарміраванне, гістарычны лёс, цяперашняе месцазнаходжанне і шляхі выкарыстання : зб. арт. – Мінск : БФК, 2002. – 364 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*7. Грэчаны, А. В.* Да адкрыцця лыжнага музея / А. В. Грэчаны // Звязда. – 1941. – 11 студз. – № 9.

*8. Гужалоўскі, А. А.* Музеі Беларусі (1918–1941 гг.) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2002. – 164 с.

*9.* Музей рэвалюцыі БССР у новым будынку // Звязда. – 1939. – 6 ліп. – № 153.

*10.* НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 11901.

*11.* НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 13984.

*12. Новік, І.* У гістарычным музеі / І. Новік // Звязда. – 1941. – 8 лют. – № 32.

*13. Саўчук, П.* Наладзіць работу музеяў / П. Саўчук // Звязда. – 1938. – 4 жн. – № 179.

*14.* У галерэі Ю. М. Пэна // Звязда. – 1941. – 18 лют. – № 41.

УДК: 73/76.04(476)+73/76.036(476)+398(476)

# ФОЛЬКЛОРНЫЕ ТРАДИЦИИ В БЕЛОРУССКОМ ИЗОБРАЗИТЕЛЬНОМ ИСКУССТВЕ 1960–1980-х гг.

***А. И. Гурченко,*** *кандидат искусствоведения, доцент, доцент кафедры межкультурных коммуникаций учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

**Аннотация.** В статье фольклоризм как универсальный метод в искусстве, характерный для всех его видов, разных исторических периодов и культурных традиций, рассматривается на примере воплощения фольклора белорусов в изобразительном искусстве 1960–1980-х гг. Значительно возросший интерес к аутентике стал характерной чертой живописи и графики, в рамках которых данная тематика активно разрабатывалась в предшествующие десятилетия. Вместе с тем устойчивый интерес к корневым традициям наметился в декоративно-прикладном искусстве и скульптуре, чего ранее не наблюдалось. Сделан вывод о том, что по степени фольклоризированности белорусское изобразительное искусство начало приближаться к музыкальному (композиторскому и исполнительскому), для которого внимание к фольклору на протяжении последних десятилетий было устойчивой тенденцией.

**Ключевые слова:** фольклорные традиции, фольклоризм, белорусское изобразительное искусство.

# FOLKLORE TRADITIONS IN BELARUS FINE ART 1960–1980s

***A. Gurchenko,*** *PhD in Art History, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Intercultural Communication of the Educational Establishment «Belarusian State University of Culture and Arts»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ